НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ЎСТУПІЎ У СВАЕ ПРАВЫ



Паўнапраўным гаспадаром уступіў новы навучальны год у студэнцкія аўдыторыі. І хоць свежыя яшчэ ўспаміны пра канікулы, будаўнічыя і бульбяныя будні, вучэбныя справы ўсё мацней захопліваюць думкі і час студэнта.

На здымку: першую лекцыю па фізіцы студэнтам I курса фізфака чытае дацэнт М. П. Халімановіч.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (1024) ● ЧАЦВЕР, 4 кастрычніка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

ТРЭЦІ РЭСПУБЛІКАНСКІ

БЮРО ЦК ЛКСМ Беларусі, прэзідыум Акадэміі навук БССР, калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і калегія Міністэрства асветы БССР прынялі пастанову аб правядзенні ў 1973-74 гадах III рэспубліканскага конкурсу работ маладых вучоных па грамадскіх навуках.

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, аспіранты, асістэнты, стажоры-даследчыкі, аўтары выдадзеных кніг, брашур, артыкулаў, нарысаў, вучэбна-метадычнай літаратуры, а таксама рукапісаў па марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковаму камунізму, палітычнай эканоміі, гісторыі КПСС, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху, праву, псіхалогіі, педагогіцы і праблемах камуністычнага выхавання моладзі. Узрост аўтара на 1 красавіка 1974 года не павінен перавышаць 33 гадоў.

Вылучаемыя на конкурс работы павінны быць самастойна выкананымі даследаваннямі па актуальных праблемах грамадскіх навук, што вызначаны пастановай ЦК КПСС ад 14 жніўня 1967 года «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве», дакументамі XXIV з'езда КПСС.

Вылучэнне, ацэнка і адбор лепшых работ праходзяць па адпаведных навуках і праблематыцы раздзельна для кніг і манаграфій—звыш трох друкаваных аркушаў; артыкулаў і брашур — да трох друкаваных аркушаў; вучэбна-метадычнай і навукова-папулярнай літаратуры — незалежна ад аб'ёму.

Конкурс праводзіцца ў два туры. ПЕРШЫ ТУР праводзіцца ў абласцях. Права вылучэння работ маладых вучоных на конкурс даецца вучоным саветам, аддзелам, лабараторыям, сектарам, кафедрам грамадскіх навук, камітэтам камсамола, саветам маладых вучоных.

Пры вылучэнні прадстаўляюцца наступныя дакументы: водгук-рэкамендацыя, кароткая анатацыя работы, характарыстыка навуковай і грамадскай дзейнасці аўтара.

У водгуку-рэкамендацыі ацэньваецца навуковы змест работы, выказваюцца крытычныя заўвагі і вызначаецца, па якой навуцы (з пералічаных у Палажэнні аб конкурсе) гэта даследаванне вылучаецца на конкурс, пералічваюцца апублікаваныя рэцэнзіі на даную работу, указваецца арганізацыя, што вылучыла работу. Калі прадстаўлена калектыўная праца, неабходна ўказаць уклад у яе кожнага аўтара.

У кароткай анатацыі аб'ёмам не больш чым 2—3 старонкі машынапіснага тэксту ўказваецца прозвішча, імя і імя па бацьку аўтара, поўная назва навуковай установы, дзе выканана работа, год яе напісання і аб'ём. У асноўнай частцы анатацыі даюцца кароткі змест работы і яе вывады. Анатацыя падпісваецца аўтарам з указаннем яго службовага і дамашняга адрасоў і тэлефонаў. Калі на конкурс вылучаецца некалькі работ, то анатацыя складаецца на кожную работу асобна.

У характарыстыцы навуковай і грамадскай дзейнасці аўтара абавязкова ўказваюцца яго прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, партыйнасць, нацыянальнасць, займаемая пасада, адукацыя, асноўныя пакazчыкі яго грамадскай і навуковай работы, публікацыі аўтара з неабходнымі данымі (кім, дзе і калі апублікавана). Характарыстыка павінна быць заверана подпісам кіраўніка адпаведнай установы, сакратарамі партыйнай і камсамольскай арганізацый.

Першы тур конкурсу заканчваецца ў студзені—лютым 1974 года. Вынікі падводзяцца на абласных нарадах маладых навуковых работнікаў і выкладчыкаў па грамадскіх навуках, уручаюцца ўзнагароды пераможцам і выносяцца рэкамендацыі аб удзельніках II тура рэспубліканскага конкурсу. Лепшыя работы прадстаўляюцца на II тур да 20 лютага 1974 года.

ДРУГІ ТУР праводзіцца ў г. Мінску і завяршаецца рэспубліканскай канферэнцыяй маладых вучоных па грамадскіх навуках у маі 1974 года. Лепшыя работы прадстаўляюцца на III тур Усесаюзнага конкурсу да 1 чэрвеня 1974 года.

Работы накіроўваюцца ў рэспубліканскі аргкамітэт конкурсу ў двух экземплярах з анатацыяй, характарыстыкай і водгукам-рэкамендацыяй абласнога аргкамітэта. Рукапісныя работы павінны быць афармлены ў адпаведнасці з інструкцыяй Усесаюзнага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі «Аб парадку прыёму, захоўвання і размнажэння ў абмежаваных тыражах навуковых работ» і складацца з тытульнага ліста, асноўнага тэксту, ілюстрацый, дадаткаў, бібліяграфіі, зместу; падшыты ў цвёрдых папках.

Пераможцы III рэспубліканскага конкурсу работ маладых вучоных па грамадскіх навуках будуць узнагароджаны дыпломамі лаўрэатаў I і II ступеняў і грашовымі прэміямі, а таксама заахвочвальнымі дыпломамі.

Прадугледжана выданне лепшых работ маладых вучоных у выдавецтвах «Наука и техника», «Высшая школа», «Народная асвета», у часопісах «Весткі АН БССР» (серыя грамадскіх навук), «Народная асвета», «Маладосць».

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Першы дзень кастрычніка па ўсёй нашай краіне стаў першым днём новага навучальнага года ў сетцы партыйнай адукацыі. Дзесяткі тысяч мінчан прыступілі да заняткаў у гуртках, школах, семінарах, і сярод іх камуністы, камсамольцы і беспартыйныя нашага універсітэта. Амаль дзве тысячы чалавек пачалі вучобу ў школах асноў марксізму-ленінізму, прыйшлі на тэарэтычныя семінары па праблемах філасофіі, эканомікі, мовазнаўства, літаратуры...

Адной з асаблівасцей сёлетняга навучальнага года з'яўляецца паглыбленая ўвага да вывучэння рашэнняў XXIV з'езда партыі, матэрыялаў урачыстага пасяджэння, прысвечанага 50-годдзю ўтварэння СССР, красавіцкага (1973 г.) Пленума ЦК КПСС. Гэтыя тэмы займаюць галоўнае месца ў праграме сістэмы партыйнай вучобы. «Праблемы дзяржавы і права ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС»—гэты семінар на юрыдычным факультэце вядзе прафесар А. В. Дулаў. На першых занятках выступіў доктар юрыдычных навук А. А. Галаўко. Нядаўна ён пабываў у Амерыцы, таму яго даклад «Навейшыя тэорыі дзяржавы і права ЗША» быў пабудаван на аснове асабістых уражанняў, суправаджаўся паказам дыяпазітываў.

Зварот да сучаснасці і марксісцка-ленінскай тэарэтычнай спадчыны, багатага вопыту дзейнасці КПСС, да нацыянальна-вызваленчай барацьбы развіваючыхся краін характэрны для новага навучальнага года. «Філасофскія праблемы сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды», «Актуальныя праблемы нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі», «Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе сацыяльныя вынікі», «Стратэгія і тактыка КПСС на асноўных этапах барацьбы за камунізм»—такія тэмы заняткаў слухачоў на журфаку, падрыхтоўчым, геаграфічным факультэтах.

...Навучальны год у сетцы партыйнай адукацыі пачаўся. Наперадзе напружаныя будні папаўнення ведаў.

С. СВЕРКУНОЎ.

ПРАДАЎЖАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

Першакурснікі... Новае студэнцкае пакаленне, прадаўжальнікі традыцый БДУ, юная надзея старэйшых. І не дзіўна, што ім з першых дзён навучальнага года асаблівая ўвага, аб іх шчыры клопат. Вось і зараз, у першы дзень заняткаў, на сустрэчу са студэнтамі першых курсаў прыродазнаўчых факультэтаў прыйшлі рэктар БДУ У. М. Сікорскі, сакратар парткома Т. Я. Дударава, прарэктары С. А. Умрэйка, Л. В. Валадзько, У. Р. Івашын, сакратар камітэта камсамола А. Слука, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый БДУ.

З цёплымі словамі віншавання да прысутных звяртаецца Усевалад Міхайлавіч Сікорскі. Ён гаворыць, што быць студэнтам БДУ не толькі ганарова, але і надзвычай адказна. І апавядае пра слаўную гісторыю старэйшай навучальнай установы Беларусі, яе традыцыі, навуковыя дасягненні і ўзнагароды, пра выкладчыкаў і вялізную армію выпускнікоў, якіх—больш 40 тысяч, пра інтэрнаты і лабараторыі, кафедры і навуковыя гуркі. Раскрывае сутнасць тых задач, што павінен вырашыць кожны, хто пачынае студэнцкі шлях, каб выйсці з БДУ добра падрыхтаваным спецыялістам.

— Ад імя рэктарата, калектыву прафесараў і выкладчыкаў, — гаворыць Усевалад Міхайлавіч, — дазвольце выказаць спадзяванне, што вы будзеце дастойна захоўваць і памнажаць традыцыі, якія склаліся ў нашым універсітэце, умацоўваць яго славу, якую стварылі папярэднія пакаленні выпускнікоў.

Ад імя партыйнай арганізацыі БДУ першакурснікаў павіншавала сакратар парткома Таццяна Яфімаўна Дударава. З яе выступлення юнакі і дзяўчаты даведаліся, дзе яны змогуць прыкласці свае сілы і здольнасці ў вольны час, якія цікавыя сустрэчы прадстаяць у сценах універсітэта, што ім дасць факультэт грамадскіх прафесій і чаго чакаюць ад новага папаўнення праслаўленыя нашы калектывы мастацкай самадзейнасці.

Па-сяброўску прагучалі парады сакратара камітэта камсамола БДУ А. Слукі: з першага дня прасякнуцца адказнасцю, не пасаваць перад цяжкасцямі, не перакладваць сваю ношу на плечы таварыша, быць дастойнымі тых, хто пісаў гісторыю універсітэта.

Напружаная вучоба, пошук у навуцы, удзел у будатрадах, спартыўная работа, актыўнае грамадскае жыццё — вось што дасць адчуць сябе сапраўдным студэнтам.

Выступленне А. Слукі дапоўніў пяцікурснік фізфака Аляксей Кавецкі. Па праву ўмудронага вопытам, ён папярэдзіў, што толькі карпатлівая, самаадданая праца на працягу ўсіх пяці год дазволіць сённяшнім першакурснікам шчасліва дайсці да выпускнога рубяжа.

Аляксей даў шэраг слушных парад і пажадаў малодшым сябрам вялікіх поспехаў.

Ад імя першакурснікаў Таня Гапанюк, студэнтка I курса факультэта прыкладной матэматыкі, сардэчна падзякавала за шчырасць і клопат усім тым, хто вёў нядаўніх абітурыентаў у краіну студэнцтва.

— І цяпер нам засталося самае важнае,—гаворыць Таня,— даказаць нашу падзяку выдатнай і добрай вучобай.

А на наступны дзень з рэктарам, прадстаўнікамі рэктарата і парткома, кіраўнікамі універсітэцкіх грамадскіх арганізацый знаёміліся першакурснікі гуманітарных факультэтаў.

Наш кар.

ЗА І СУПРАЦЬ

РАЗВАЖАННІ ПАСЛЯ СХОДУ

Частка першая, уступная, у якой аўтар не будзе паўтараць прапісных ісцін, пакінуўшы іх на заключэнне, а толькі папросіць чытачоў паставіць сабе некалькі пытанняў.

— Чаму так сумна жывуць некаторыя камсамольскія групы і курсы?

— Адкуль бярэцца фармалізм у камсамольскай рабоце?

— Якой павінна быць камсамольская арганізацыя супрацоўнікаў вну?

Аўтар папярэджвае, што і адказы на пытанні чытачы павінны шукаць самі.

Частка другая, канстатуючая.

Роўна ў 14-00 ў 201-й аўдыторыі хімфака пачаўся справаздачна - выбарны сход камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў факультэта. Са 115 членаў ВЛКСМ прысутнічала 67—75 чалавек (разрыў паміж пачатковай і канчатковай лічбамі растлумачаць цікаўным члены бюро, якія прысутнічалі на сходзе). Справаздачны даклад сакратара камсамольскага бюро Уладзіслава Гуслева цягнуўся крыху больш пяці хвілін (рэгламент быў устаноўлен галасаваннем). Даклад займаў дзве з паловай старонкі стандартнай паперы. У ім коратка гаварылася аб рабоце ўсіх пяці сектараў бюро.

У спрэчках па дакладу выступіла загадчыца палітыка - выхаваўчага сектара Аліна Браценнікава. Дзяўчына паспрабавала задаць прысутным пытанні, якія прапанаваны аўтарам у пачатку артыкула. У адказ чуліся крыкі: «Рэгламент!», раздаваўся смех.

Перш чым пачаць выбары новага саставу бюро, старшыня сходу кінуў кліч:

— Таварышы, цаніце час!

Але таварышы яго не цанілі, таму выбарную частку цягнулі амаль паўгадзіны (!). Увесь час, пакуль прапаноўвалі кандыдатуры, у аўдыторыі стаяў устойлівы гул.

Галасаванне прайшло дружна. Калі трэба — усе галасавалі і за, і супраць (супраць — з лозунгам: выратуем чалавека!).

У састаў бюро было выбрана 7 чалавек.

Уладзіслаў Гуслеў лічыць, што сход прайшоў актыўна і ўвогуле — нармальна.

Частка трэцяя, выніковая, у якой аўтар свядома паўтарае вядомыя ісціны, лічачы, што яны вядомы ўсё ж такі не ўсім.

Ісціна першая:

Сум і абыякавасць знікаюць тады, калі з імі змагаюцца.

Аля Браценнікава, якая выступіла ў спрэчках па дакладу, гаварыла, што ўсе недахопы ў рабоце камсамольскай арганізацыі растлумачваюцца, у першую чаргу, пасіўнасцю камсамольцаў. Кожны жыве сам па сабе, лічачы, што нейкія там «агульныя мерапрыемствы» людзям з вышэйшай адукацыяй не патрэбны. І ў той жа час у кулуарах вядуць доўгія і разумныя гутаркі аб праблеме некамунікабельнасці.

Толькі можа вінавата не адна пасіўнасць?

Ісціна другая:

Фармалізм губіць жывое дрэва творчасці.

І тое, як таропка выкладаў справаздачу Уладзіслаў Гуслеў і як спяшаўся старшыня сходу, і нарэшце тое, што ад партбюро хімфака выступала А. М. Барысенка, адказная за культмасавую работу, якая сама шчыра прызналася: «Камсамольскую работу я ведаю дрэнна, але мне здаецца, што справы ў вас неблагія», — усё гэта і прымушае думаць, што фармалізм тут пусціў глыбокія карэнні.

А мог жа зрабіць аналіз і слушныя вывады Уладзіслаў. Магла шчыра пагаварыць з таварышамі член бюро Света Некрашэвіч. Мог, магла, маглі... Але не зрабілі. Таму «душэўныя парывы» Аліны Браценнікавай і загінулі сярод раўнадушша залы.

Ісціна трэцяя і апошняя, сугучная з ісцінай другой:

Грамадскую работу павінны выконваць людзі самаадданыя.

Аўтар не стане абвінавачваць членаў бюро камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў хімфака ў поўнай адсутнасці ўсякай ахвоты працаваць на грамадскай ніве. Ён толькі асмельваецца заўважыць, што, акрамя жадання, павінны быць любоў да справы і пэўныя веды, якія дае практыка. І галоўнае — уменне працаваць з людзьмі.

Л. ДРУЗЕВА.
(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).

ДРУЖБА КВІТНЕЕ

Ужо шмат год існуе добрая традыцыя: студэнты з розных універсітэтаў ГДР разам з савецкімі юнакамі і дзяўчатамі авалодваюць ведамі ў аўдыторыях нашага універсітэта, працуюць разам у будаўнічых атрадах, разам адпачываюць.

У гэтым годзе на філалагічны факультэт прыехала на стажыроўку вялікая група будучых выкладчыкаў рускай мовы з Лейпцыгскага, Грэйфсвальдскага, Магдэбургскага і Дрэздэнскага універсітэтаў. На працягу дзесяці месяцаў студэнты з ГДР будуць слухаць лекцыі па спецыяльных дысцыплінах: сучаснай рускай мове, гістарычнай граматыцы рускай мовы, рускай класічнай і савецкай літаратуры, па курсу «Асноўныя праблемы навуковага камунізму». Вялікае месца зойме практыка вуснай і пісьмовай мовы.

З дапамогай вопытных кансультантаў з ліку выкладчыкаў філалагічнага і гістарычнага факультэтаў стажоры павінны будуць сабраць матэрыял для сваіх будучых дыпломных работ.

Студэнты праяўляюць жывы інтарэс да нашай рэчаіснасці, прымаюць удзел у экскурсіях.

Напярэдадні нацыянальнага свята народу Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі хочацца павіншаваць маладых будаўнікоў сацыялізму і пажадаць ім вялікіх поспехаў.

В. БУДАЙ,

АВАЛОДВАЕМ РУСКАЙ МОВАЙ

У нас у ГДР цяпер даволі многа школ з пашыраным выкладаннем рускай мовы. Яе пачынаюць вывучаць ужо з трэцяга класа. У такой школе і я ўпершыню пазнаёмілася з рускім алфавітам, вывучыла першую рускую песеньку, упершыню прачытала ўрыўкі з твораў савецкіх пісьменнікаў у арыгінале. З году ў год расла мая цікавасць да рускай мовы. Пасля заканчэння VIII класа я паступіла ў спецшколу, якая рыхтуе да паступлення ў педагагічную вну. Я вучылася там чатыры гады. Па рускай мове ў нас заняткі ўжо праводзіліся як ў інстытуце. Мы вывучалі рускую і савецкую літаратуру, мовазнаўства, геаграфію і гісторыю Савецкага Саюза. Практычныя заняткі па рускай мове ў нас вялі савецкія настаўнікі.

Лепшыя дзесяцікласнікі ўдзельнічаюць у рэспубліканскай алімпіядзе рускай мовы, якая адбываецца ў маі кожнага года ў Берліне.

Пасля заканчэння школы я паступіла ва універсітэт у горадзе Грэйфсвальдзе, дзе ўжо два гады вучуся ў секцыі мовазнаўства і літаратуразнаўства. За гэты час я некалькі разоў працавала перакладчыцай, ездзіла з савецкімі турыстамі па ГДР. У мінулым годзе я суправаджала групу нямецкіх спецыялістаў, якія праходзілі сямітыднёвую практыку на Чарапавецкім металургічным заводзе. Гэта паездка была вельмі цікавая і павучальная.

І вось я зноў у Савецкім Саюзе.

Дружба моладзі нашых краін — гэта залог брацкіх адносін нашых народаў. Тут, у Мінску, мы жывём у інтэрнаце разам са студэнтамі БДУ. Мы разам харчуемся, разам сочым за чысцінёй у пакоях. Мы імкнёмся як мага больш гаварыць па-руску. Нашы савецкія сябры аказваюць нам усялякую дапамогу. Таму мы ўпэўнены, што праз год у нашым багажы будуць не толькі сувеніры з Савецкага Саюза, але і багатыя веды, і ўспаміны пра вашу гасцінную краіну.

Петра ЗАУЭРМАН.

Мы дзякуем!

У Мінск мы прыехалі з чатырох гарадоў ГДР: Дрэздэна, Лейпцыга, Грэйфсвальда і Магдэбурга.

Мы ўсе ўжо многа чулі пра Савецкі Саюз, але большасць з нас упершыню прыехалі ў вашу краіну. І адразу з вялікай цікавасцю пазнаёміліся з горадам, яго гісторыяй, культурай, грамадскім жыццём.

Сталіца Беларускай ССР з самага пачатку зрабіла на нас вялікае ўражанне. Асабліва спадабаліся новыя жылыя раёны, мноства прыгожых паркаў і універсітэцкі гарадок.

Мы дзякуем за магчымасць вучыцца ў Мінску і асабіста пазнаёміцца з савецкімі людзьмі, у першую чаргу—са студэнтамі. Мы пастараемся выкарыстаць гэты год для таго, каб удасканаліць нашы веды па рускай мове, больш даведацца аб жыцці савецкага народа. Нам дапамагаюць усе нашы выкладчыкі, а таксама студэнты, з якімі мы разам жывём у інтэрнаце.

Ужо сёння хочацца сказаць усім, хто аказвае нам такую вялікую падтрымку, вялікае дзякуй.

Хана ВЕЛЬДРЫХ,
староста групы стажораў з ГДР.

На здымках: група стажораў з ГДР на занятках па практыцы гутарковай і пісьмовай мовы.





ПАРАДЫ ПЕРШАКУРСНІКУ

ЯК ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ КПСС

Вывучэнне грамадскіх навук у вышэйшай школе пачынаецца з гісторыі КПСС. Студэнты нашага універсітэта вывучаюць гісторыю КПСС на I—II курсах на працягу трох семестраў. За гэты час яны здаюць адзін залік і два экзамены.

Гісторыя КПСС як грамадская гістарычная навука мае свой канкрэтны прадмет вывучэння. Яна вывучае заканамернасці ўзнікнення і развіцця марксісцка-ленінскай партыі — кіруючай сілы рабочага класа і ўсіх працоўных, перадавога атрада міжнароднага камуністычнага руху ў барацьбе за перамогу дыктатуры пралетарыята, за пабудову сацыялізму і камунізму. У прадмет вывучэння гісторыі КПСС уваходзіць вывучэнне праграмы і палітыкі партыі, яе стратэгіі і тактыкі, метадаў кіраўніцтва масамі, умацаванне яе сувязі з працоўнымі. Важнейшым прынцыпам навуковага падыходу пры вывучэнні гісторыі КПСС з'яўляецца гістарызм. Прынцып гістарызму патрабуе канкрэтна-гістарычнага падыходу пры разглядзе грамадскіх з'яў. Другім важным прынцыпам навуковага вывучэння гісторыі КПСС з'яўляецца ленінскі прынцып партыйнасці. Ён патрабуе падыходзіць да ацэнкі гістарычных падзей, дзейнасці партыйных арганізацый і некаторых асоб з класавых пазіцый, з інтарэсаў рабочага класа і ўсіх працоўных.

Важнейшымі крыніцамі па гісторыі Камуністычнай партыі з'яўляюцца творы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, рэзалюцыі і рашэнні з'ездаў, канферэнцый і Пленумаў ЦК КПСС, матэрыялы міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, а таксама працы вядомых дзеячоў КПСС і Савецкай дзяржавы і іншыя дакументы.

Асноўнымі вучэбнымі дапаможнікамі з'яўляюцца шматтомная гісторыя Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, падручнік «Гісторыя КПСС», чацвёртае выданне пад рэдакцыяй Б. Н. Панамарова, а таксама курсы лекцый па гісторыі КПСС Вышэйшай партыйнай школы і Акадэміі грамадскіх навук, курс лекцый пад рэдакцыяй С. І. Мурашова для студэнтаў тэхнічных, сельскагаспадарчых і медыцынскіх вну, а таксама курс лекцый нашага універсітэта пад рэдакцыяй У. М. Сікорскага і іншыя выданні. Наша бібліятэка і два кабінеты па гісторыі КПСС маюць дастатковую колькасць твораў класікаў марксізму-ленінізму і іншую неабходную літаратуру для вывучэння гісторыі КПСС. Такім чынам, ёсць усе неабходныя ўмовы для глыбокага вывучэння гэтага курса.

Асноўнымі формамі і метадамі вывучэння гісторыі КПСС на стацыянары і вячэрнім аддзяленні з'яўляюцца лекцыі, семінарскія заняткі, кансультацыі і самастойная работа над першакрыніцамі. Важным сродкам авалодання глыбокімі ведамі з'яўляецца лекцыя. У лекцыі прафесар, дацэнт імкнуцца раскрыць важнейшыя праблемы тэмы, найбольш складаныя тэарэтычныя палажэнні і вывады. Па ходу лекцыі ў студэнтаў могуць узнікаць тыя ці іншыя пытанні. У гэтым выпадку належыць звярнуцца да лектара пісьмова ў ходзе лекцыі або вусна ў канцы яе. Слуханне лекцыі—гэта напружаная праца. Тут патрабуецца бесперапынная ўвага, свядомая самадысцыпліна. Належыць запісваць асноўны змест лекцыі. Абавязкова трэба старацца дакладна запісваць абагульняючыя палажэнні і вывады лектара.

Пасля лекцыі неабходна прагледзець, прадумаць і дапрацаваць свае запісы: адрэдагаваць тэкст, удакладніць некаторыя палажэнні і факты, цытаты, высветліць значэнне новых слоў, выкарыстаўшы энцыклапедыі, слоўнікі і іншую даведніцкую літаратуру.

Важным сродкам замацавання і паглыблення ведаў з'яўляюцца семінарскія заняткі. Планы семінарскіх заняткаў распрацаваны і зацверджаны на кафедрах. Яны раздаюцца студэнтам на першым курсе і разлічаны на ўсе тры семестры. У планах указваецца літаратура, якую студэнт абавязан вывучыць па тэме к кожным заняткам.

Вопыт паказвае, што семінарскія заняткі па гісторыі КПСС толькі тады прыносяць вялікую карысць і задавальненне студэнтам, калі ўсе слухачы рыхтуюцца і прымаюць у іх актыўны ўдзел. Для таго, каб добра і грунтоўна падрыхтавацца, неабходна дасканала прадумаць усе пытанні, якія будуць абмяркоўвацца на семінары. Неабходна карыстацца сваімі лекцыйнымі запісамі, а таксама старанна вывучыць і законспектаваць неабходнук плану семінара. Ры ўсіх пытаннях семі важна не толькі пра пабудаваць і сплана на кожнае пытанне чанага матэрыялу, ва ўсіх аспектах гэт зумець іх значэнне для развіцця сусве нага працэсу.

На семінарах сту вучыцца выкладаць зумела, канкрэтна, не чытаць свае зап спектам, складзень ніцах, можна і т але нельга быць яго, як гэта бывае дэнтаў. Вельмі важ расказваецца, было на. Некаторыя сту пачатку заняткаў н адмаўляюцца высту ваючы гэта тым, шт добра гаварыць. Г га. Семінары, як а няткаў, для таго і дэнты маглі пас правільна, змястоў свабодна выкладац ба заўсёды помніц студэнт будзе выст ён будзе расшыра свае веды, тым ля здаваць залікі і эк

Па меры неабх

НОВЫЯ КНІГІ

па аўтаматыцы і вылічальнай тэхніцы, якія паступілі ў бібліятэку ў верасні 1973 года

● Автоматизация проектирования в электронике. Республиканский межведомственный научно-технический сборник. (№ 7. Киев, «Техника», 1973).

● Автоматика и электромеханика. Сборник, посвященный памяти академика В. С. Кулебакина. (М., «Наука», 1973).

● Гусев, В. Г. Методы исследования точности цифровых автоматических систем. (М., «Наука», 1973).

● Дехтяренко, П. И. и Коваленко, В. П. Определение характеристик звеньев систем автоматического регулирования. (М., «Энергия», 1973).

● Жарков, Г. М. и Рыжов, А. Б. Программирование для цифровой вычислительной машины «Наири». (М., Изд-во Московского университета, 1973).

● Методические рекомендации по программированию на языке ФОРТРАН ИФВЭ-67. (Минск, 1972).

● Оптимизация. Исследование операций. Бионика. (Докл. конф. Отв. ред. Я. З. Цыпкін. М., «Наука», 1973).

● Точность и надежность кибернетических систем. (Киев, «Наукова думка», 1972).

● Цейтлин, Я. М. Проектирование оптимальных линейных систем. (Л., «Машиностроение», 1973).

● Численные методы и автоматическое программирование. Сборник работ под ред. В. Н. Кублановской и С. Г. Михлина. (Л., «Наука», 1973).

У БІБЛІЯТЭЦЫ

У студэнцкай бібліятэцы цяпер можна без дапамогі бібліятэкара пазнаёміцца з навінкамі вучэбнай літаратуры. За некалькі хвілін своеасаблівы інфарматар перагорне перад вамі свае металічныя старонкі, на якіх рэкламуюцца кнігі 30 назваў, паступіўшыя ў продаж. Хацелася б толькі, каб, акрамя назвы, паведамляўся і кошт кнігі.

Інфармацыйная навінка дасць студэнтам магчымасць аператыўна сачыць за выхадам вучэбнай літаратуры і своечасова набываць неабходныя падручнікі.

Т. МЕЛЬНІКАВА.

ДЫРЭКТАР

Кожны год Дзень настаўніка адзначаюць і тысячы выпускнікоў нашага універсітэта, якія працуюць у розных кутках рэспублікі і нават за яе межамі. Пра адну з іх, выпускніцу філалагічнага факультэта 1954 года, дырэктара 122-й мінскай школы І. А. Саковіч і пойдзе наш расказ.

Калі вы ўдачна выбралі справу і ўклалі ў яе ўсю душу, то шчасце само вас адшукае.

К. Д. Ушынскі.

ШКОЛА

Урачыстую цішыню раптам прарэзаў залівісты званок. І ажылі, зазвінелі дзіцячымі галасамі калідоры і лесвіцы. Чамусьці ўспомніліся мае колішнія вучні з маленькай палескай вёсачкі Літвінавічы, дзе на вялікім перапынку было гэтак жа шумна, гэтак жа востра пахла крэйдай і свежавымытай падлогай.

Да пачатку наступнага ўрока заставалася некалькі хвілін. Выкладчыкі са стосамі сшыткаў і класнымі журналамі ў руках адзін за другім пакідалі настаўніцкую. Тыя, у каго была «фортка», вялі нетаропкую гаворку. На маю просьбу расказаць пра Ірыну Аляксандраўну адклікнуліся ахвотна:

— Вельмі добры чалавек.

— Уся аддаецца рабоце.

— Гэта яе намаганнямі наша школа стала такім палацам.

...Год назад будаўнікі толькі здалі чарговы аб'ект — школу. Тады вось і выклікалі Ірыну Аляксандраўну Саковіч, дырэктара 66-й школы ў райком партыі. Прапанавалі прыняць новую школу. За дваццаць год працы Ірына Аляксандраўна прывыкла ўжо, што яе заўсёды пасылаюць «на прарыў». Яшчэ ў 1954 годзе, адразу пасля заканчэння філфака БДУ, накіравалі інспектарам райана ў Міёрскі раён. Праплакала Іра ўсю ноч: баялася адказнасці, незнаёмых месц. А раніцай выцерла вочы і паехала ў самую глухую вёску інспектаваць школу. На другі год працавала ўжо дырэктарам дзесяцігодкі, потым у абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў у горадзе Маладзечна, у інстытуце педагогікі ў Мінску. І ніколі не прасіла даць работу паспакайней і павыгадней. Вось і цяпер, здавалася б, так наладзіліся справы ў 66-й...

Як прыйшла ўпершыню ў новую школу — вохнула. Будаўнікі пакінулі столькі смецця, што і за год не вывезеш. Ды і сам будынак з бруднымі вокнамі — змрочны, няўтульны.

Прыходзіла на работу раніцай, а ішла дадому познім вечарам. Разам з настаўнікамі і тэхнічкамі чысціла і прыбірала класы, потым «выбівала» абсталяванне для кабінетаў. У тыя жнівеньскія дні яе кватэра была ператворана ў склад: школа прыбіралася, а абсталяванне трэба ж было недзе зберагчы. Ды і сама яна тады мала была падобна на афіцыйную асобу: у рабочым халаціку, з хусткай на галаве. «Начальства», якое прыйшло неяк паглядзець «асабістым вокам» на новую школу і запатрабавала дырэктара, спачатку нават падазрона на яе глядзела. Вельмі ўжо не адпавядала сваёй пасадзе гэта жанчына ў чорным халаце і з бутэрбродам у руцэ.

Зараз школа сапраўды як палац. Чыстыя светлыя калідоры і класы, цудоўна абсталяваныя кабінеты літаратуры, фізікі, хіміі, актавая зала, сталовая, майстэрні. Нядаўна адкрыт музей В. І. Казлова, за права насіць імя якога змагаецца піянерская дружына. А колькі задум у дырэктара! Школа ж растучая. Зараз у ёй 1600 навучэнцаў, а ў наступным годзе будуць яшчэ і дзесятыя класы.

ПЕДАГАГІЧНАЕ КРЭДА

У райана яе папярэдзілі адразу: настаўнікаў дадуць з розных школ горада, у асноўным тых, хто па нейкіх прычынах «не ўжыўся». Яна разумела, што стварыць сапраўдны калектыў тут будзе нялёгка, але заўсёды лічыла, што галоўнае, каб кожны быў на сваім месцы. А настаўнік — асабліва. Настаўнік — гэта чалавек своеасаблівых духоўных якасцей. Ён — сейбіт ведаў і выхавацель пакаленняў. Таму ў рабоце настаўніка не павінна быць ні малейшай фальшы, ні нацяжак. І калі сама цэлымі днямі працавала ў школе, імкнулася, каб успрынялі гэта як нешта само сабой зразумелае. Дапамагала парадамі, літаратурай, нешта неўзаметку падказвала. Былі і трывожныя дні, і бяссонныя ночы. Быў і шумны сход з прычыны ананімкі, дасланай кімсьці ў райана. Было ўсё. Не прыйшло толькі адно: расчараванне.

Калі нехта з настаўнікаў гаворыць, што ў Ірыны Аляксандраўны ёсць чаму павучыцца, гэта не проста словы. Разумны, эрудзіраваны педагог-інтэлектуал, які выдатна ведае не толькі методыку выкладання, псіхалогію, але востра адчувае кожны рух чалавечай душы, горача любіць людзей, верыць ім.

Толькі што закончыўся ўрок літаратуры ў 8-м «Д» класе, на якім вучні гутарылі пра наватарства од Дзяржавіна, знаёміліся з творчасцю Фанвізіна. Настаўніца Інэса Іванаўна Шалахвостава хвалявалася: у гэтым годзе яна ўпершыню выкладае ў старэйшых класах. Хвалюецца і цяпер, перад пачаткам разбору ўрока.

Тут, у кабінеце Ірыны Аляксандраўны, ціха і ўтульна. Кветкі, асенні пейзаж на сцяне. Нічога лішняга на рабочым стале.

— Ну, што вы, Інэса Іванаўна, самі скажаце аб сваім уроку? Голас у Ірыны Аляксандраўны мяккі, інтанацыя добразычлівая. Уважліва выслухоўвае жанчыну. Потым робіць свае заўвагі, дае парады. Расказвае настаўніцы аб мэце наведання. Падкрэслівае, як важна ўзняць на ўроку праблему, прымусіць дзяцей думаць і спрачацца. Асцярожна, тактоўна высвятляе, чым карысталася настаўніца пры падрыхтоўцы да ўрока і прапануе:

— У наступны раз пачніце расказ пра Фанвізіна словамі Пушкіна: «Сатиры смелый властелин...»

Да сябе на ўрокі Ірыну Аляксандраўну запрашаюць ахвотна. Просяць пабольш крытыкаваць. Ведаюць: парады дырэктара заўсёды слушныя. Пакрысе вучацца ў яе педагагічнаму майстэрству і захапляюцца яе педагагічным талентам. Крыўд амаль не бывае.

ПАПЛЕЧНІКІ

Неяк мы гутарылі з Ірынай Аляксандраўнай пра калектыў школы. Яна сказала тады:

— Мне лёгка працаваць. Людзі адчулі адказнасць.

Год — тэрмін невялікі. Але за гэты кароткі час усе 76 настаўнікаў сталі аднадумцамі, сябрамі. Нават навічкі хутка адчуваюць сябе тут як дома. А малады настаўнік гісторыі Ц. Ф. Шапавал стаў проста незамянімым. Ён і палітінфармацыі выдатныя рыхтуе, і класны кіраўнік неблагі. А нядаўна загарэўся ідэяй абсталяваць сапраўдны кабінет гісторыі.

— Мне з імі лёгка...

Кожную суботу збіраецца нарада завучаў. Расказваюць пра справы за тыдзень, дзеляцца меркаваннямі, трывогамі.

Такую нараду тут называюць: «нарада пры дырэктары». Толькі гэта не афіцыйная справаздача, а шчырая размова-гутарка людзей, аб'яднаных адной справай. Пры такой еднасці ўсё агульнае: і гора, і радасць. Таму калі на адкрытым партыйным сходзе, прысвечаным рабоце з камсамольцамі, Ірына Аляксандраўна абвясціла, што іх 122-я школа заняла першае месца ў Савецкім раёне па падрыхтоўцы да новага навучальнага года, на тварах прысутных з'явілася не проста задавальненне, а нешта большае.

АПОШНЯЯ НАСТАЎНІЦА

На дзвярах школы вісіць аб'ява: «...З 14 гадзін прымае наведвальнікаў дэпутат раённага савета І. А. Саковіч». Ужо трэці год яна — дэпутат. Узначальвала камісію па народнай асвеце. Цяпер вось зноў папрасілі выступіць на камісіі па стварэнню бібліятэчнага фонду і забеспячэнню школ падручнікамі.

— Ведаеце, не хапае нават часу адказаць на пісьмо з Румыніі. Прыслала настаўніца. Я сёлета выкладала на курсах у горадзе Брашаве рускую мову. Пісьмо шчырае, а шчырасць заўсёды ўзрушвае неяк.

«...Ірына Аляксандраўна!

Піша Вам адна з настаўніц восьмай групы. Вы памятаеце, мабыць, нашу групу. Я была заўсёды каля Вас. У класе я сядзела заўсёды за першай партай ля дзвярэй, і ў мяне часам балела галава. Вы далі мне лякарства. Пасля лекцыі я Вам сказала, што ў Вас не 22 сябры, а амаль 200 сяброў.

...Вы, Ірына Аляксандраўна, выдатны чалавек. Калі б я хацела выразіць гэта пісьмова, я напісала б: «Чалавек».

Першага верасня я пачынаю работу ў школе. Я буду імкнуцца выкладаць урокі так, як вучылі Вы.

...Я не буду крыўдзіцца, калі Вы напішаце мне аб маіх памылках, бо Вы мая апошняя настаўніца.

З сяброўскім прывітаннем Якаб Анжэла».

Л. ПЕРАСЫПКІНА.

літаратуру па
ацца трэба па
а. Пры гэтым
аць, правільна
ць свой адказ
аснове выву-
і разабрацца
пытанняў, зра-
ля сучаснасці,
га рэвалюцый-

ты павінны на-
вае думкі зра-
імі словамі, а
Канешне, кан-
па першакры-
а карыстацца,
рыкаваным да
некаторых сту-
каб усё, што
обра прадума-
ты, асабліва ў
ершых курсах,
ць, растлумач-
яны не могуць
а рабіць нель-
ая форма за-
уюць, каб сту-
ва навучыцца
літаратурна і
вае думкі. Трэ-
што чым часцей
ць, тым больш
і замацоўваць
й будзе яму
ены.
насці для сту-

дэнтаў арганізуюцца кансультацыі. Але адным з важнейшых сродкаў глыбокага вывучэння гісторыі КПСС з'яўляецца самастойная работа студэнтаў, вывучэнне першакрыніц, іх канспектаванне. Таму вельмі важна з першых дзён вучобы выпрацаваць уменне і навыкі самастойнай работы над творамі класікаў марксізму-ленінізму і партыйнымі дакументамі.

Ужо ў першым семестры студэнтам прадстаіць вывучыць «Маніфест Камуністычнай партыі» К. Маркса і Ф. Энгельса, працы У. І. Леніна «Што рабіць?», «Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі», «Крытычныя заметкі «па нацыянальнаму пытанню», «Вайна і расійская сацыял-дэмакратыя», «Аб лозунгу Злучаных Штатаў Еўропы», «Ваенная праграма пралетарскай рэвалюцыі» і іншыя ленінскія працы і дакументы. Для таго, каб скласці канспект, рэкамендуецца спачатку прачытаць усю працу і зразумець яе агульны сэнс і змест. Пры гэтым можна зрабіць заметкі аб структуры працы, аб асноўных палажэннях і вывадах. Пасля папярэдняга азнаямлення, пры паўторным чытанні працы належыць вызначыць асноўныя думкі аўтара і іх развіццё, звярнуўшы ўвагу на абгрунтаванне асобных палажэнняў, на метады і формы доказаў, найбольш яркія прыклады. Зрабіўшы такую работу, можна прыступіць да складання канспекта, коратка, сваімі словамі выкладаючы асноўны змест твора ў адпаведнасці з яго главамі, раздзеламі або важнымі пытаннямі. Канспект можа быць розным па форме, але ва ўсіх выпадках запіс павінен паслядоўна ахопліваць галоўныя пытанні твора. Некаторыя важныя палажэнні аўтара неабходна цытаваць, указваючы ў канспекце адпаведную старонку работы.

Важны і знешняе афармленне канспекта, дакладнасць запісаў, палі, вызначаная сістэма падкрэслівання, размяшчэнне частак асноўных палажэнняў твора.

У працэсе работы над першакрыніцамі па гісторыі КПСС неабходна звярнуць увагу на навуковы апарат: заўвагі, зноскі, спасылкі і іншыя крыніцы, прадмову ад рэдакцыі, тлумачэнні складальнікаў, імянныя ўказальнікі і г. д.

Уважлівае азнаямленне з заўвагамі і тлумачэннямі дазволіць лепш зразумець змест твора. Такім чынам, творчая работа на лекцыі, падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў, самастойная праца над першакрыніцамі будзе садзейнічаць глыбокаму вывучэнню гісторыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

А. МІХАЙЛАЎ,
дацэнт.

БУДНІ СТУДЭНЦКІЯ



Спецкурс па метадах хімічнага аналізу ў чацвёртакурснікаў хімфака вядзе прафесар Вольга Раманаўна Скараход.

Фота Д. Чаховіча.

НА СТАРТАХ ГПА

Другі год упэўнена крочыць па краіне новы фізкультурны комплекс ГПА. У работу па арганізацыі здачы комплексу ўключыўся і калектыў хімічнага факультэта. Створана камісія па комплексу ГПА, якую ўзначальвае намеснік дэкана В. Ф. Цікавы. Падрыхтоўка і ход здачы норм неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэннях спартыўна - масавай камісіі. Ужо каля 200 чалавек зверылі свае сілы з новымі нарматывамі. З іх па гімнастыцы — 134 чалавекі, па стральбе — 70, па плаванню — 30, па лёгкай атлетыцы — 54.

Да паслуг супрацоўнікаў новы добры стадыён БДУ на вуліцы Кастрычніцкай, з бітумным пакрыццём, з бегавымі дарожкамі, сектарамі для скачкоў і кідання. На жаль, мала жанчын пажадалі выйсці на старты ГПА. Многія спасылаліся на ўзрост і занятасць.

І тым больш прыемна адзначыць поспехі актывістаў ГПА кандыдата навук Л. І. Севасцьянавай, дацэнта М. В. Кнігі ў V ступені «Бадзёрасць і здароўе», дацэнта Л. І. Продан у IV ступені, а таксама старшай лабаранткі, майстра спорту З. М. Пачакуевай, якая здала ўсе нормы на залаты значок, аспіранткі Т. С. Прытыцкай.

І ўсё ж у цэлым актыўнасць хімікаў у здачы норм ГПА пакуль невысокая.

Хочацца пажадаць уноў выбраным старшыням камісій факультэта больш удзяляць увагі спартыўна - масавай рабоце. І ў прыватнасці здачы новага комплексу ГПА.

М. ЦЕРАХАВА,
інструктар МК.



Шые лісцямі восень дыван залаты...

Фотаэцюд Д. ЧАХОВІЧА.

НЕЗАБЫЎНАЯ ПАРА

Прамільгнула лета, клопаты і справы новага навучальнага года захапілі студэнтаў і выкладчыкаў, але успаміны аб незабыўнай пары канікул працягваюць хваляваць. І дагэтуль тэмы летняга адпачынку абмяркоўваюцца горача і натхнёна пры сустрэчах сяброў, у студэнцкіх інтэрнатах.

З задавальненнем успамінаюць свае канікулы замежныя студэнты, якія вучацца на асноўных факультэтах БДУ. На радзіме пабывалі 56 чалавек, двое наведалі іншыя краіны, 127 студэнтаў працавалі ў калгасах і саўгасах, на заводах, 42 — у будаўнічых атрадах Мінскай вобласці. Гасцінна сустрэлі нашых выхаванцаў дом адпачынку «Нарач», пансіянат «Буравеснік». Многія студэнты і аспіранты лячыліся ў санаторыях. З аўтапаяздамі «Дружба» больш дваццаці замежных студэнтаў падарожнічалі па Беларусі, Украіне, Азербайджану.

У час адпачынку на Нарачы вельмі ўрачыста і весела прайшла сустрэча замежных студэнтаў з камсамольцамі і моладдзю Мядзельшчыны.

Вялікае ўражанне засталося ад экскурсіі ў Вільнюс. Замежныя студэнты пазнаёміліся са славутасцямі сталіцы Літоўскай ССР і яе навакольнай мясцовасцю.

Цікавыя мерапрыемствы былі прымеркаваны да каляндарных свят. Так, Дню рыбака была прысвечана сустрэча з рабочымі рыбзавода «Нарач» і гутарка. У Дзень Ваенна-Марскога і Дзень Паветранага Флоту СССР праводзіліся гутаркі «Ваенна-Марскі Флот на варце міру» і гутарка-кінафільм аб Дні Паветранага Флоту СССР. З успамінамі аб сваёй службе выступілі былыя воіны і афіцэры. Масавае спартыўнае свята адбылося 14 жніўня ва Усесаюзны дзень фізкультурніка. Быў адзначан і Дзень будаўніка. Святочна і весела прайшло свята «Няптуна», дзень імянінніка.

Студэнты былі гасцямі піянерскага лагера «Зубронак», наведалі мясцовы краязнаўчы музей, зрабілі прагулкі на цеплаходзе па возеру «Нарач».

Ва ўсіх мерапрыемствах актыўны ўдзел прымалі многія замежныя студэнты. Каля сарака чалавек былі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці. На інтэрнацыянальным вечары, прысвечаным X Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў, які праходзіў пад дэвізам «Няхай заўсёды будзе сонца!», выступілі і расказалі аб барацьбе моладзі сваіх краін студэнты Мухамед Эшран Хусейн (Бангладэш), Вольдэедо Дзінку (Эфіопія), Чан Дык Ван (ДРВ). Сваімі ўражаннямі падзяліўся ўдзельнік X Сусветнага фестывалю Мартынес Сардынес Рубен (Мексіка).

Рэгулярна выпускалася насценная газета «Дружба». Усеагульную ўвагу не толькі замежных студэнтаў, але і ўсіх адпачываючых прыцягвала фотагазета «Як мы адпачываем».

Вялікімі падзеямі ў жыцці дома адпачынку «Нарач» былі месячнік савецка-в'етнамскай дружбы, у час якога арганізоўваліся вечары дружбы, выступленні з дакладамі і святкаванне Дня жнівеньскай рэвалюцыі ў В'етнаме. На гэтых вечарах прысутнічалі сотні адпачываючых. В'етнамскіх сяброў віталі прадстаўнікі мясцовых арганізацый, савецкія студэнты. У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці замежных навучэнцаў БДУ, БПІ, які прайшоў з вялікім поспехам.

У пансіянаце «Буравеснік» усе студэнты БДУ прымалі актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці. У сімпозіуме, прысвечаным ролі моладзі ў нацыянальна-вызваленчым руху Азіі, Афрыкі і краін Лацінскай Амерыкі, актыўны ўдзел прыняў студэнт з В'етнама Чан Вен Бе. Аспірант з Румыніі Мітакі Страт выступіў на інтэрнацыянальным вечары.

Нашы студэнты ўдзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах па настольнаму тэнісу, выступалі на канцэртах, удзельнічалі амаль ва ўсіх экскурсіях: наведалі Сухумі, Сочы, Туапсе, хадзілі ў горы і ў турысцкія паходы.

Група нашых студэнтаў разам з прадстаўнікамі 40 краін свету, якія вучацца ў вну Масквы, Ленінграда, Кіева, Адэсы, Сімферопаля, Львова, Харкава, Растова, Астрахані, Валгаграда, ўдзельнічала ў інтэрнацыянальным студэнцкім паходзе па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Украінскай ССР. Удзельнікі паходу ўсклалі кветкі ля помніка У. І. Леніну ў Кіеве і былі ўдзельнікамі мітынгу. Аўтапоезд прайшоў па маршруту Кіеў — Палтава — Харкаў — Варашылаўград — Краснадон — Данецк — Запарожжа — Крэменчуг — Чаркасы — Корсунь-Шаўчэнкаўскі — Канеў — Кіеў.

На вечарах сустрэчы з грамадскасцю, моладдзю гарадоў са словамі ў адказ на прывітанні выступалі прадстаўнікі розных краін. У Варашылаўградзе, напрыклад, слова было прадастаўлена выпускніцы БДУ Любе Іванавай (НРБ).

Вялікае ўражанне зрабіла наведанне ў горадзе Краснадоне мемарыяльнага комплексу і музея маладагвардзейцаў, музеяў Палтаўскай і Корсунь-Шаўчэнкаўскай бітваў, музеяў Т. Р. Шаўчэнкі і А. Гайдара, горада Канева, дзе ўстаноўлен помнік Т. Р. Шаўчэнку.

У паходзе ішло спаборніцтва на лепшае афармленне аўтобуса плакатамі, транспарантамі, на арыгінальны дэвіз аўтобуса, на лепшае афармленне альбома і паходнага лістка. Актыўны ўдзел у мастацкім афармленні альбома і паходных лісткоў прыняў студэнт з ДРВ То Туан. Ён быў узнагароджан памятным сувенірам.

А тыя, хто падарожнічаў па Азербайджанскай ССР, пазнаёміліся са славутасцямі Баку, пабывалі ў г. Геакчай — адміністрацыйным цэнтры аднаго з буйных бавоўнавых раёнаў Азербайджана, у Мінгечауры, адным з індустрыяльных цэнтраў рэспублікі, пазнаёміліся ў г. Шэкі з гісторыка-архітэктурнымі помнікамі, выязджалі ў горад-курорт Закатаны і ў Сумгаіт. У многіх гарадах студэнты сустракаліся з рабочымі, калгаснікамі, творчай інтэлігенцыяй, моладдзю, піянерамі і школьнікамі, пазнаёміліся з традыцыйнай гасціннасцю азербайджанскага народа.

Усе студэнты БДУ задаволены гэтай цікавай паездкай. Яны прымалі актыўны ўдзел у выпуску паходнага лістка аўтобуса. Студэнт з Судана Самір Шахін даў інтэрв'ю карэспандэнту газеты «Агні Мінгечаура», а таксама выступіў з артыкулам аб сваіх уражаннях аб паездцы ў газеце «Моладзь Азербайджана».

Група, у якой былі студэнты з ДРВ, НРБ і Афганістана, правяла 10 дзён у Маскве. Госці сталіцы зрабілі экскурсію па горадзе, наведалі кватэру-музей і кабінет У. І. Леніна ў Крамлі, музей У. І. Леніна ў Горках-Ленінскіх, Маўзалей, музей рэвалюцыі, Крэмль, ВДНГ, паркі культуры і адпачынку. А студэнты, якія гасцілі ў Ленінградзе, наведалі Дзяржаўны Эрмітаж, Петрапаўлаўскую крэпасць, Музей гісторыі Ленінграда, музей У. І. Леніна, Марсава поле, Піскарэўскія мемарыяльныя могілкі, Музей гісторыі рэлігіі і атэізму. Незабыўнымі былі экскурсія на цеплаходзе ў Петрадварэц і Пушкіна, а таксама аўтобусная экскурсія па месцах апошняга падполля У. І. Леніна і наведанне іншых славутасцей горада Ленінграда.

Замежныя студэнты аднадушна адзначаюць, што іх летні адпачынак быў арганізаван цудоўна. Яны добра адпачылі, набраліся сіл і выказваюць за гэта сваю сардэчную падзяку.

К. ГЕРМАН,
дэкан па навучанню замежных студэнтаў, доктар гістарычных навук.

Парады ўрача

ПРАЯВІЦЕ ВОЛЮ

Ведучы прыём хворых, мы даволі часта чуем такія скаргі: працяглы кашаль, дрэнны апетыт, колючы боль у вобласці сэрца, бяссонніца, зніжэнне памяці і г. д. Праз некалькі хвілін высвятляем, што нашы пацыенты шмат курацъ.

Правядзіце такі эксперымент: палічыце свой пульс, затым выкурыце папяросу і зноў палічыце. Ваша сэрца пачало біцца на 15—18 удараў часцей. Цяпер успомніце, колькі разоў такім чынам вы падганяеце сваё сэрца? Дык ці варта здзіўляцца, калі яно ўрэшце знясільваецца, парушаецца яго рытм і сіла скарачэння?

У дыме табаку ўтрымліваецца радыёактыўны элемент палоній. Ён можа выклікаць не толькі рак лёгкіх, але і страўніка, почак, кішэчніка, мачавога пузыра. Адмовіцца ад курэння могуць дапамагчы некаторыя медыкаментозныя сродкі, але галоўнае — гэта ваша воля.

Яна павінна праявіцца і ў адмове ад «чарачак». Народная прыказка гаворыць: «Рака пачынаецца з ручайка, а п'янства з чарачкі». Алкаголь падобны на наркотык, да яго можна лёгка прывыкнуць. Здадзен экзамен (паспяхова — «замачыць», правал — «аблегчыць» душу), атрымана стыпендыя, сустрэча пасля канікул — і пайшло далей. Чалавек становіцца рабом сваёй прывычкі. Алкагольныя напоі ткі паступова, крок за крокам разбураюць чалавечы арганізм.

У першую чаргу алкаголь знішчальна дзейнічае на нервовыя клеткі, парушае працу кары галаўнога мозгу. У выпіўшага чалавека слабее памяць, ён хутка стамляецца, рэзка паніжаецца прадукцыйнасць працы. Такім чынам, «замачыць» адзін паспяхова здадзены экзамен — значыць атрымаць двойку за наступны.

Ужыванне нават нязначнай колькасці алкаголю прыводзіць да хваравітых парушэнняў сардэчнай дзейнасці. Растлумачваецца гэта тым, што пад уплывам алкаголю крываносныя сасуды расшыраюцца, і, каб забяспечыць бесперабойнае забеспячэнне ўсіх органаў крывёй, сэрцу прыходзіцца пачашчаць свой рытм. Узмоцненая нагрузка сардэчнай мышцы вядзе к яе стамленню, тлушчаваму перараджэнню. У выніку — задышка, сэрцабіцце, ацёкі ног, азызглы твар, болі ў вобласці сэрца.

Алкаголь асабліва небяспечны для печані — галоўнай хімічнай лабараторыі нашага арганізма, таму што клеткі печані гінуць, на іх месцы развіваецца рубцовая тканка, а яна не можа выконваць складаную хімічную працу. У выніку — цыроз, атручванне арганізма.

Выклікаючы першапачаткова паляпшэнне апетыту, алкаголь затым прыводзіць к гастрытам, таму што наступае атрафія слізістай абалонкі страўніка.

Я не гавару аб тым, да чаго прыводзіць п'янства ў вадзіцеляў транспарту, таму што гэта ўсім вядома. Вялікі працэнт злачынстваў адбываецца ў стане ап'янення. Таму не ўсміхайцеся іранічна на словы: «П'янства — зло», паверце — гэта сапраўды так.

А. ШУНЬКО,
урач.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 Аб'ём—1 друк. ар.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 17797 Зак. 1138. Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.